**24.** Колькі займеннікаў ужыта ў вершаваных радках М. Пазнякова?

*Разгулялася наўкруг*
*Юная мяцеліца,*
*Лебядзіны белы пух*
*Мне пад ногі сцелецца.*
*Зіхаціць уся зямля*
*Радасцю святлістаю,*
*І таптаць шкадую я*
*Коўдру серабрыстую.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**25.** Дадзены словазлучэнні: *1) палымянны заклік; 2) брылёўскі стыль; 3) Купалаўскія чытанні; 4) коласавы творы; 5) вогнены шар; 6) абедзены перапынак.* Вызначце, дзе ў напісанні прыметнікаў дапушчаны памылкі.

**А)** ва ўсіх словазлучэннях. **Б)** няма памылак. **В)** 1, 3.
**Г)** 1, 4, 5, 6. **Д)** 2, 3, 5.

**26.** Алесю неабходна было выбраць з прыведзеных слоў толькі даўнія народныя назвы галаўных убораў: *1) гафтка; 2) гарусоўка; 3) тараноўка; 4) дратаванка; 5) шабета; 6) шарак.* Дапамажыце хлопчыку выбраць правільны варыянт.

**А)** няма патрэбных назваў. **Б)** усе словы.
**В)** 1, 3, 4, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 5, 6.

**27.** У рускай мове ёсць выраз: *пронизывающий ветер, сопровождающийся характерным звуком*. Як называецца па-беларуску пра такі вецер у народзе?

**А)** скавыш. **Б)** вожаг. **В)** віскуцень. **Г)** вітка. **Д)** вяршняк.

**28.** Каму належыць літаратурны псеўданім ***Васіль Вітка***?

**А)** Цімоху Васільевічу Крысько.
**Б)** Канстанціну Міхайлавічу Міцкевічу.
**В)** Андрэю Іванавічу Александровічу.
**Г)** Івану Якаўлевічу Навуменку.
**Д)** Івану Іванавічу Калесніку.

**29.** *Пераменнае выкарыстанне асобай дзвюх моў называецца ...*
Выберыце правільныя тэрміны з прапанаваных:

*1) дуэт; 2) двухмоўе; 3) дыялог; 4) дыграф; 5) білінгвізм; 6) дылогія.*

**А)** 1, 3. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 2, 5. **Д)** 5, 6.

**30.** У якіх сказах з прыведзеных ёсць моўныя недакладнасці?
*1) Для вопытаў хлапчукі прынеслі драўняны вугаль.*
*2) Для гэтай мясцовасці быў характэрны ліставы лес, бо раслі ў асноўным бярозы, асіны.*
*3) Шафёр зусім нічога не бачыў на дарозе у дажджлівай імгле.*

**А)** у сказах няма памылак. **Б)** памылкі дапушчаны ва ўсіх сказах.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01; e-mail: info@bakonkurs.org*
*http://www.bakonkurs.org/*

ГА «БА «Конкурс». Заказ 10. Тыраж 31200 экз. г. Мінск. 2008 г.

# Конкурс па беларускай мове
# **“БУСЛІК-2008”**

*Чацвер, 21 лютага 2008 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Аленка прачытала ў сшытку свайго малодшага брата вершаваныя радкі Н. Галіноўскай «Будзь уважлівы, пешаход», якія той запісаў у школе. Але ў апошнім радку не хапала слоў. Як вы думаеце, якое словазлучэнне не дапісаў брат Аленкі?

*Толькі там ісці павінен,*
*Дзе адзначаны пераход.*
*Калі ты без дысцыпліны,*
*Значыць, ...*

**А)** паслухмяны грамадзянін. **Б)** добры пешаход.
**В)** дрэнны пешаход. **Г)** добры вучань. **Д)** някемлівы юнак.

**2.** Колькі дзеючых асоб у народнай пацешцы?

*У куце сядзіць мядзведзь,*
*Хустку вышывае,*
*А лісічка-невялічка*
*Хатку прыбірае.*
*А каток пячэ аладкі,*
*Маслам палівае.*
*Мышанятка жвава, гладка*
*Катку памагае.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**3.** Вучань спазніўся на ўрок і хоча папрасіць прабачэння. Што яму трэба сказаць? Выберыце правільны выраз.

**А)** дзякаваць вам. **Б)** даруйце мне, калі ласка. **В)** пашкадуйце мяне.
**Г)** пазваніце бацькам. **Д)** да пабачэння.

**4.** Вызначце, якія словы з прапанаваных запісаны няправільна:

*1) бясхмар’е; 2) цымент; 3) беражаце;*
*4) смеяцеся; 5) ассістэнт; 6) двукосе.*

**А)** 1, 2, 3, 4. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 3, 4. **Г)** 2, 5, 6. **Д)** 5, 6.

**5.** Аленцы патрэбна было ў заданні вызначыць род назоўнікаў: *1) плакса; 2) забіяка; 3) мурза; 4) задавака*. На дапамогу прыйшлі яе сяброўкі. Юля сказала, што гэта назоўнікі мужчынскага роду, Маша – ніякага роду, Іра – жаночага роду, Яніна – агульнага роду, Соня – род нельга вызначыць. Хто даў правільны адказ?
**А)** Юля. **Б)** Маша. **В)** Іра. **Г)** Яніна. **Д)** Соня.

**6.** Знайдзіце ў пераблытаных літарах адгадку на загадку Васіля Жуковіча:
*На ўсіх суяблінках тонкіх*
*Вісяць званочкі-гронкі,*
*Духмяныя, срабрыстыя,*
*Нібы расінкі, чыстыя.*
**А)** д, ш, а, н, л, ы. **Б)** а, н, і, а, б, р. **В)** я, в, ш, і, н.
**Г)** і, р, ч, а, э, к, п. **Д)** е, і, к, п, с, а, р, л.

**7.** На народнае свята Купалле кажуць: *«Сёння Купала, а заўтра ...»*. Закончыце народнае выслоўе.
**А)** зажынкі. **Б)** Пакровы. **В)** Дар'я. **Г)** Ян. **Д)** Юр'я.

**8.** Дадзены словы: *1) спяванне; 2) імя; 3) акно; 4) духмянасць; 5) мора; 6) сваякі*. Выберыце назоўнікі, якія маюць толькі два склады.
**А)** 1, 3, 5. **Б)** 1, 4, 6. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 2, 5, 6. **Д)** 3, 5, 6.

**9.** Колькі слоў можна ўтварыць з гукаў [***г***], [***ш***], [***д***], [***ч***], [***к***]?
**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**10.** Як вядома, у беларускай мове абавязкова трэба ставіць над літарай ***ё*** дзве кропкі, інакшай не заўсёды можна зразумець сэнс слова ў сказе. У якіх словах з прапанаваных лексічнае значэнне зменіцца, калі не будзе кропак над літарай ***ё***?
*1) лёд; 2) ёсць; 3) лёс; 4) ёлка; 5) мёд.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх, акрамя 1. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 2, 5.

**11.** Вучні вырашылі ісці ў паход па дарозе, уздоўж якой быў насып. Адзін хлапчук сказаў: *«А я ведаю, што гэты насып інакш называецца...»* Як называецца насып уздоўж дарогі? Выберыце правільны варыянт.
**А)** груд. **Б)** грот. **В)** грэбля. **Г)** кавальер. **Д)** кавалькада.

**12.** Васіль склаў і запісаў словазлучэнні: *1) будзённы дзень; 2) сцюдзёная пара; 3) пчаліны рой; 4) дзённы клопат*. Якое словазлучэнне хлопчык запісаў няправільна?
**А)** усе словазлучэнні запісаны правільна. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**13.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце мяккі знак?
*1) дз..ве; 2) дз..веры; 3) абедз..ве; 4) ледз..ве; 5) дз..вюма; 6) дз..муць.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 3, 6. **Г)** толькі 4. **Д)** 4, 6.

**14.** У народзе часам гавораць: *«Пачакайце, за квадранец прыйду»*. Гэта значыць:
**А)** прыйду заўтра. **Б)** прыйду праз пятнаццаць хвілін.
**В)** прыйду за пэўную ўзнагароду. **Г)** прыйду праз гадзіну.
**Д)** прыйду пасля вячэры.

**15.** Падбярыце з прыведзеных слоў сінонім(-ы) да слова ***адчай***:
*1) самастойнасць; 2) безвыходнасць; 3) гераізм;*
*4) няволя; 5) безнадзейнасць; 6) роспач.*
**А)** няма сінонімаў. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 5, 6. **Г)** 4, 5. **Д)** толькі 6.

**16.** Дадзены словы: *1) бюро; 2) моц; 3) ВНУ; 4) насып; 5) шампунь; 6) засень; 7) палын*. Выберыце толькі назоўнікі мужчынскага роду.
**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 4, 5. **В)** 2, 3, 6. **Г)** 3, 4, 6. **Д)** 4, 5, 7.

**17.** Вызначце правільны адпаведнік да рускай фраземы *«за тридевять земель»*:
*1) даганяй ветру ў полі;* *2) ні пылу ні следу;*
*3) за блізкім светам;* *4) за лыжку яды сем вёрстаў хады;*
*5) даць лататы;* *6) за вялікімі барамі, за глыбокімі вадамі;*
*7) як назаўтра трэба.*
**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 7. **Г)** 3, 6. **Д)** 5.

**18.** У якім раздзеле моваznаўства вывучаюцца правілы вымаўлення слоў?
**А)** графіка. **Б)** арфаграфія. **В)** лексікаграфія.
**Г)** арфаэпія. **Д)** фанетыка.

**19.** Які месяц у народзе здаўна называюць *«гаручым, але не даручым»*?
**А)** май. **Б)** ліпень. **В)** жнівень. **Г)** красавік. **Д)** верасень.

**20.** Назоўнік ***канфуз*** мае значэнне – *'няёмкае выпадковае здарэнне, якое выклікае збянтэжанасць, сорам; стан няёмкасці, збянтэжанасці, сораму'*. Як правільна сказаць пра чалавека, які лёгка бянтэжыцца, сарамлівы? Выберыце правільны варыянт з прыведзеных:
*1) канфузны; 2) канфузісты; 3) канфузлівы.*
**А)** усе варыянты. **Б)** 1, 3. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**21.** Закончыце народную прыказку: *Добрае слова, як …*
**А)** птушка ў небе. **Б)** палавіна справы. **В)** гасцей няма.
**Г)** рыба ў вадзе. **Д)** дождж у засуху.

**22.** Выберыце з прыведзеных слоў толькі лічэбнікі:
*1) сотка; 2) пяцёрка; 3) двойка; 4) трэць; 5) абодва; 6) другі.*
**А)** усе словы. **Б)** няма лічэбнікаў. **В)** 1, 2, 3, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 5, 6.

**23.** Вучні павінны былі ўставіць у сказе замест кропак патрэбны назоўнік: *З даўніх часоў у народным уяўленні беларусаў лічыцца ... не толькі карыснай, але і шкоднай птушкай, бо крадзе зерне, асабліва сланечнікаў.* Дапамажыце вучням выбраць правільны варыянт.
**А)** сарока. **Б)** крумкач. **В)** чыжык. **Г)** верабей. **Д)** шпак.